**Вольга Міхайлава**

**Вядучы бібліятэкар
Бібліятэкі Віцебскага дзяржаўнага
тэхналагічнага ўніверсітэта**

# СІМВАЛ КАХАННЯ, ШЧАСЦЯ І ДАБРАБЫТУ

Рэспубліка Беларусь мае глыбокія гістарычныя карані і багатую культурную спадчыну. Вялікае значэнне ў развіцці традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў мелі народныя абрады. Імі суправаджаліся асноўныя падзеі грамадскага і сямейнага жыцця. Асабліва паэтычнымі і маляўнічымі былі каляндарныя і сямейныя святы.

17 красавіка 2023 г. у бібліятэцы Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта правялі тэатралізаваны народны абрад «Вясельны каравай» [1]. Фальклорную спадчыну нашых продкаў арыгінальна прадставілі супрацоўнікі бібліятэкі ўстановы адукацыі.

Каравай – гэта сакральны атрыбут, вялікі прыгожы пірог, які сімвалізуе багацце, дабрабыт будучай сям'і. Вясельны каравай павінен пячыся ў хатах нявесты і жаніха. Продкі верылі, што такім чынам пераплятаюцца лёсы двух родаў. Абрад пачынаўся з запрашэння ў хату нявесты каравайніц, «каб расшчыніць караваю Божага дару». Галоўная з іх – хросная маці. Астатнія жанчыны павінны быць замужам і мець дзяцей.

Выпяканне каравая – гэта рытуалы замесу цесту і выпечкі пірага. Кожны этап падрыхтоўкі пачынаўся з таго, што хросная маці прасіла благаслаўлення ў бацькоў: «Бацька, маці, благаславіце каравай мясіце», «Ці ёсць у гэтага дзіцяці бацька ды маці, ці дазволіце каравай расчыняці?». На што атрымлівалі станоўчы адказ: «У Божы час, у добры час. Як у людзей, так і ў нас. Саступі, Божа, з неба, Як нам цяпер трэба. Дапамажы нам каравай замясіць».

Абрад «Вясельны каравай» з пачатку і да канца суправаджаецца благаслаўленнямі, песнямі, танцамі. Вось і ў бібліятэцы прагучалі спевы «А ў нас сёння навіна…», «Знаем мы, знаем, што ў гэтым каравай», «А чыя ж то жана каравай мясіла?». Гэтыя песні ўнікальныя, маюць адзін напеў і адметную манеру выканання, эмацыянальную сілу. Песні разам з караваем з'яўляюцца моцным абярэгам усяго дзеяння.

Прыгожым фіналам абраду стала частаванне гасцей сапраўдным вясельным караваем.



Абрадавая культура нашых далёкіх продкаў адыходзіць у нябыт, застаецца толькі ў памяці бабуль і дзядуль. Такія мерапрыемствы дапамагаюць даведацца пра старадаўнія традыцыі, звярнуцца да сваіх каранёў.

ЛІТАРАТУРА

1. **Театрализованный** белорусский народный обряд «Вясельны каравай» [Электронный ресурс] / Библиотека ВГТУ. – 2017-2022. – Режим доступа: https://library.vstu.by/teatralizovannyj-belorusskij-narodnyj-obryad-vyaselny-karavaj/. – Дата доступа: 05.07.2023.

Summary

The article describes the Belarusian folk ritual “Wedding loaf” which was conducted by the staff of the library of the Vitebsk State Technological University.